– На сённяшні момант можна сказаць, што мы паспяхова спраўляемся з усім, што было запланавана на гэты перыяд. Цяпер у Полацку і Сале (Марока) вядзецца самая важная праца — распрацоўка планаў устойлівага энергетычнага развіцця, і гэтая праца ўжо блізкая да завяршэння. Мы плануем, што да канца гэтага года або на пачатку наступнага планы будуць скончаныя і зацверджаныя на гарадскім узроўні, пасля чаго павінна пачацца іх непасрэдная рэалізацыя. Распрацоўка Планаў для Полацка і Сале ёсць, мабыць, адным з самых галоўных вынікаў нашага праекта. Наколькі яны эфектыўныя, будзе відаць толькі праз некалькі гадоў, але сёння мы лічым поспехам ужо той факт, што такія дакументы будуць створаныя і прынятыя да выканання. На наш погляд, гэта ўжо вялікае дасягненне, улічваючы той факт, што ні ў Беларусі, ні ў Марока такіх планаў на гарадскім узроўні пакуль не ствараласся, то бок мы ў гэтым сэнсе — першапраходцы. Спадзяемся, на нас будуць арыентавацца і іншыя гарады рэгіёна Еўрапейскага інструмента добрасуседства і партнёрства. Ёсць у нашага праекта і незапланаваныя станоўчыя вынікі. Напрыклад, горад Фрыдрыхсгафэн (Германія), вядучы партнёр праекта і пабрацім Полацка, які спачатку не планаваў уступаць у Пакт мэраў, у верасні таксама далучыцца да яго разам з Полацкам і Сале.

Якія цяжкасці ўзнікаюць пры рэалізацыі гэтага праекта?

– Асноўныя цяжкасці нашага праекта звязаныя з тым, што яго ажыццяўляюць партнёры з пяці розных краін: Германіі, Беларусі, Марока, Іспаніі ды Францыі. У кожнай з гэтых краін сваё заканадаўства, прычым асабліва адчуваецца розніца паміж беларускім, мараканскім і еўрапейскім заканадаўствам. Напрыклад, заключэнне дамоваў, любыя закупкі або тэндары ў Беларусі неабходна праводзіць у адпаведнасці і з беларускімі правіламі, і з правіламі Еўракамісіі.

Якое месца праект займае ў энергетычнай палітыцы Беларусі?

– Калі казаць пра фінансавы бок, то маштаб праекта не вельмі вялікі. Бюджэт складае каля 790 тысяч еўра. Тым не менш, план устойлівага энергетычнага развіцця закладае асновы для больш мэтанакіраванай рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне энергазберажэння і выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі ў Полацку, а таксама для прыцягнення інвестыцый — як унутраных, так і знешніх.

Якую ролю адыгрываюць жыхары Полацка ў рэалізацыі праекта?

– Мы рэгулярна інфармуем жыхароў Полацка і Беларусі пра вынікі і асноўныя падзеі ў межах праекта. Рэпартажы аб праекце рэгулярна з'яўляюцца ў мясцовай і нацыянальнай прэсе, а таксама на мясцовых і нацыянальных радыёстанцыях і тэлеканалах. Але мы разумеем, што простага апавяшчэння жыхароў не дастаткова, трэба яшчэ і далучаць палачан да саміх мерапрыемстваў праекта. Наша асноўная мэта — змяніць стаўленне мясцовых жыхароў да спажывання электрычнасці, вады і цяпла, паспрыяць таму, каб палачане разумелі, што эканоміць энергію і рэсурсы – у іх інтарэсах. Таму ў наступным годзе спецыяльна для жыхароў Полацка мы правядзем Дні энергетыкі. Мы плануем арганізаваць опэн-эйр конкурсы і акцыі на вуліцах горада, будзем раздаваць сувеніры ды інфармацыйныя матэрыялы на тэму энергаэфектыўнасці, правядзем спецыяльныя заняткі ў полацкіх школах.

Ці былі ўжо выпадкі, калі іншыя беларускія гарады бралі прыклад з самага старажытнага горада Беларусі?

– Зусім нядаўна скончыўся конкурс праектных прапаноў па праграме Еўрапейскага Саюза «Пакт мэраў рушыць на ўсход» («Covenant of Mayors Going East»). Праграма разлічана на гарады ў рэгіёне Усходняга партнёрства. Яе асноўная мэта — дапамагчы гарадам гэтага рэгіёна ўступіць у Пакт мэраў, распрацаваць і ўкараніць у сябе планы ўстойлівага энергетычнага развіцця. Праграма была адкрыта ўжо пасля таго, як пачаўся праект SURE, і ў нас ёсць усе падставы лічыць, што пры яе распрацоўцы выкарыстоўваўся ў тым ліку і наш досвед.

Вынікі конкурсу пакуль не вядомыя, але мы ўжо ведаем, што некалькі беларускіх гарадоў узялі ўдзел у конкурсе праектных прапаноў. Спадзяемся, што праекты з іх удзелам будуць ухваленыя, і яны, па шляху Полацка, далучацца да Пакта мэраў.

У сваю чаргу Полацк будзе рады падзяліцца набытым досведам з іншымі беларускімі гарадамі. У прыватнасці, у рамках праекта будуць выдавацца друкаваныя матэрыялы, дзякуючы якім спецыялісты з іншых гарадоў змогуць даведацца пра перавагі далучэння да Пакта мэраў і пра тое, як Полацк ствараў і выкарыстоўваў план устойлівага энергетычнага развіцця.


Падрабязная інфармацыя: **http://www.ciudad-programme.eu**

Форум гражданского общества Восточного партнерства: белорусы надеются скоординировать свои действия

Белорусские НГО готовятся к Третьему форуму гражданского общества (ФГО) стран-участниц Восточного партнерства, который пройдет в Познани 28–30 ноября 2011 года. Что ожидают от предстоящего форума представители гражданского общества Беларуси и как они оценивают эффективность предыдущих встреч? На эти вопросы отвечают представители негосударственных организаций страны, делегированные для участия во встрече в Познани.



Елена Тонкачева, председатель правления Центра правовой информации:




– Третий форум в Познани я рассматриваю как возможность обмена мнениями о программе. Хочу подчеркнуть, что белорусским представителям предстоит работать в обстановке, существенно отличающейся от прошлогодней.

На втором форуме были рассмотрены разработанные нашими НГО «дорожные карты» сближения Беларуси с европейскими процессами, и мы были убеждены, что впереди год активной работы по налаживанию взаимодействия с госинститутами, государственными организациями, год развития. И мы были готовы к диалогу, но он оказался невозможен. В контексте правозащитной повестки дня, на третьем форуме, видимо, придется обсуждать сложившуюся ситуацию. Вместо диалога с властью нам предстоит говорить о подавлении инициатив гражданского общества, репрессиях, наличии в стране 50 политзаключенных. Потому мои ожидания сводятся к тому, что правозащитный аспект нынешних белорусских реалий — основная тема для переговоров с нашими властями, и она распространяется на все сферы сотрудничества в рамках программы «Восточное партнерство».

Успехом и итогом работы белорусов в рамках ФГО можно считать работу «национальной платформы» и выработку механизмов делегирования представителей НГО для участия в форуме.

Денис Мельянцов, старший аналитик Белорусского института стратегических исследований:



– Форум гражданского общества окончательно не оформлен как отдельная институция, над этим предстоит поработать в ноябре. Форум должен утвердить правила избрания делегатов, процедуры работы, постоянные органы, обеспечивающие его деятельность. Белорусской делегации предстоит определить формат участия в рамках Форума гражданского общества, сформулировать цели и пути их достижения.

Трудность заключается в том, что изначально задачей форума были мониторинг и оценка межгосударственных проектов в рамках Восточного партнерства, разработка рекомендаций для правительств своих стран и Еврокомиссии. Однако в случае с Беларусью это проблематично, поскольку двустороннего сотрудничества между Беларусью и ЕС нет, а многосторонние проекты в рамках Восточного партнерства с участием белорусской стороны также не начаты — отсюда и кризис идентичности белорусской Национальной платформы форума, а Восточное партнерство в отношении Беларуси не работает.

Вместе с тем Форум гражданского общества является хорошей площадкой для коммуникации белорусских НГО с их коллегами из ЕС и других стран, активно участвующих в Восточном Партнерстве. Форум гражданского общества служит одним из немногих каналов для доведения мнения белорусского гражданского общества до европейской общественности.

Ольга Карач, руководитель общественного объединения «Наш дом»:



– Главное достижение в рамках Форума гражданского общества — создание площадки для диалога между НГО стран-участниц Восточного партнерства. Для Беларуси это пространство, в котором может звучать голос гражданского общества и где можно нарабатывать опыт успешного диалога, который между различными структурами внутри Беларуси пока минимален. Надеюсь, что белорусы приедут на форум со скоординированной общей позицией, и рассчитываю на такую же скоординированную позицию участников Форума гражданского общества в отношении Беларуси и их солидарность с нашим гражданским обществом.

Владимир Мацкевич, руководитель Агентства гуманитарных технологий:



– Говоря о надеждах, мы вынуждены считаться с состоянием самого гражданского общества в Беларуси, которое все еще никак не может осознать своей роли и своего места не только в международных процессах, но даже внутри страны. Однако это не умаляет достижений белорусов в рамках Форума гражданского общества, ведь и благодаря белорусской делегации программа «Восточное партнерство» продвинулась в измерении, касающемся гражданского общества. Еврокомиссия, например, поддержала наши предложения и усилия по организации национальных платформ для взаимодействия различных структур и организаций, независимо от их политических взглядов.

Нам удается продвигать разрабатываемые в структурах гражданского общества «дорожные карты», формулировать мнения и оценки по ключевым аспектам Восточного партнерства — госуправления, экономики, энергетики, экологии, взаимодействия между людьми.

Сайт Форума гражданского общества Восточного партнерства: **http://www.eap-csf.eu**

Европейский опыт для людей с проблемами психического здоровья в Беларуси



Международное общественное объединение «Голос сердца» (Беларусь) и общественное объединение «Глобальная инициатива в психиатрии» (Литва) при финансовой поддержке ЕС уже второй год осуществляют проект «Развитие потенциала негосударственных организаций для решения вопросов в области психического здоровья в Республике Беларусь».

О целях и задачах, проблемах и рисках рассказывает руководитель проекта, председатель правления МОО «Голос сердца» Светлана Блай (на фото):

– Наш проект, стартовавший 1 декабря 2010 года, — результат тесного и многолетнего сотрудничества белорусской общественной организации «Голос сердца» и литовской «Глобальной инициативы в психиатрии». Мы ставим своей целью помочь людям, имеющим отклонения в психическом здоровье, адаптироваться в обществе, занять в нем свое место и чувствовать себя защищенными. Поскольку это одна из наиболее уязвимых групп населения, наша задача — защита и расширение их прав и возможностей.

Наши партнеры и единомышленники — белорусские НГО, деятельность которых связана с проблемами психического здоровья, а также масс-медиа. Для представителей 20 негосударственных организаций мы планируем провести ряд обучающих мероприятий. В марте 2011 года уже проведены два тренинга для НГО, работающих в области психического здоровья. В июле состоялся первый тренинг, касающийся вопросов взаимодействия таких НГО со средствами массовой информации. Такие занятия дают знания и навыки, которые помогают в дальнейшем эффективно защищать права людей с особенностями развития, принимать участие в обсуждении социальных реформ в области психического здоровья. Средства массовой информации — наша особая целевая группа. Мы готовим тренинги для журналистов, ведь именно от степени понимания ими проблемы, их чувства такта и решительности зависит формирование адекватного и объективного общественного мнения о людях с особенностями психического развития. Журналисты должны рассказывать о непростой жизни этих людей так, чтобы, по замыслу авторов проекта, вызывать не только пассивное сочувствие, но и желание оказать помощь и поддержку тем, кто хочет чувствовать себя полноправным членом общества, но лишен сегодня такой возможности по объективным или субъективным причинам.

Как обеспечить жизнеспособность начинаний в рамках проекта и после окончания сроков его реализации?

– Хочу надеяться, что наша работа поможет сформировать правильное, гуманное отношение общества к людям с проблемами психического здоровья. Чтобы изучить реальную ситуацию и подготовить оптимальный план мероприятий, мы проведем два опроса общественного мнения. Надеемся, что общественные организации и средства массовой информации помогут наладить диалог с местными органами власти, которые, собственно, и призваны решать проблемы людей с ограниченными возможностями и — что также весьма важно — проблемы членов их семей.

Чтобы обеспечить необратимость перемен и по окончании формальных сроков проекта, важен не только человеческий фактор, но и заинтересованность руководителей регионов. Мы приложим все усилия, чтобы общественные организации, инициаторы проекта, его участники, местные органы власти, люди с ограниченными возможностями и их семьи всегда работали «в одной связке».

Цели проекта ясны и гуманны, однако, очевидно, есть сложности на пути его реализации?

– Я бы назвала их рисками. Итак, мы предполагаем, что даже после тщательного отбора получателей финансовой поддержки (субгрантов) в рамках проекта сохраняется вероятность, что получатели не смогут правильно управлять проектом и использовать выделенные деньги на планируемые виды деятельности. Десять белорусских НГО получили финансирование для реализации отобранных проектных инициатив.

Не исключено, что журналисты — партнеры проекта все же не смогут точно осветить существующие проблемы, понимание и осознание которых необходимо для изменения отношения белорусского общества к людям с особенностями психического развития. Мы также опасаемся и негативной реакции представителей государственных органов на публикации в СМИ или информационные мероприятия по вопросам психического здоровья; мы предполагаем, что будут иметь место критика и недоверчивое отношение к деятельности НГО, вовлеченных в проект. Однако мы ищем способы минимизации этих рисков.

Применим ли в Беларуси зарубежный, в частности европейский опыт?

– За рубежом, особенно в странах Европейского Союза, эта тема давно является предметом заботы общества и государства. Здесь сложилась система охраны психического здоровья, сформирована определенная этика поведения в отношении людей с особенностями в развитии, четко определена роль гражданского общества в решении вопросов, связанных с помощью и поддержкой таких людей и их семей. Хотелось бы использовать этот опыт в Беларуси: например, особенно ценен опыт упразднения интернатов, количество которых в стране достигает сорока четырех. У нас есть возможность избежать грубых ошибок, допущенных в других странах.

Пётр Казакевіч: «Польскія ініцыятывы былі б немагчымымі без актыўнага і плённага супрацоўніцтва з нашымі беларускімі партнерамі»

1 ліпеня 2011 года — пачатак старшынства Польшчы ў Радзе Еўрасаюза. З гэтай нагоды запланавана шмат культурных ды іншых імпрэзаў, якія адбудуцца ў тым ліку і ў Беларусі.

Пра гэта расказвае дырэктар Польскага Інстытута ў Мінску **Пётр Казакевіч**:

Якія імпрэзы плануюцца ў Беларусі ў сувязі з польскім старшынствам у Еўрасаюзе?

– Польшча добра ўсведамляе значэнне свайго старшынства ў ЕС. Прадугледжаны цэлы шэраг палітычных, эканамічных і сацыяльных праграм, сустрэч, канферэнцый ды іншых праектаў, якія маюць вялікае значэнне для Польшчы як часткі Еўропы.

Мы ўпэўненыя, што неад'емнай часткай гэтай працы павінна быць культурная праграма старшынства Польшчы ў Радзе ЕС, мэта якой — адлюстраванне шматграннай і вельмі багатай культуры нашай краіны.

Маючы такую магчымасць, Польшча імкнулася як мага шырэй прэзентаваць свае дасягненні ў галіне мастацтва, музыкі, тэатра і кіно, дасягненні, якія, на наш погляд, заслугоўваюць таго, каб быць вядомымі не толькі на радзіме і нават не толькі ў Еўрасаюзе, але і ў свеце. Яшчэ адным важным аспектам, якім мы кіраваліся пры планаванні праграмы, была сучасная Польшча і тыя культурныя вяршыні, якіх яна дасягнула ў апошнія дзесяцігоддзі, пасля здабыцця незалежнасці. З ліпеня да снежня 2011 года ў 10 сталіцах па ўсім свеце плануецца правесці каля 400 імпрэзаў. У Мінску іх адбудзецца каля сарака.

Галоўным ініцыятарам праграмы выступае Інстытут Адама Міцкевіча ў Варшаве, які займаецца распрацоўкай і ажыццяўленнем шматлікіх замежных культурных праектаў. Польскае Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны стварыла таксама праграму «Польскае старшынства — Promesa 2011», у межах якой былі абраныя найбольш цікавыя і якасныя падзеі ды тэндэнцыі ў польскай культуры.

Вельмі шмат імпрэзаў ладзяць польскія дыпламатычныя і культурныя прадстаўніцтвы за мяжой. У Беларусі, напрыклад, гэтую ролю выконвае Польскі Інстытут у Мінску.



Ствараючы праграму, мы, па-першае, засяроджвалі ўвагу на важных для Польшчы постацях: Чэслаў Мілаш, Караль Шыманоўскі, Станіслаў Лем. Мы імкнуліся таксама прадставіць тое, што ў нашай звычайнай дзейнасці было вельмі няпроста рэалізаваць – паказаць складаныя ў тэхнічным сэнсе, з удзелам вялікай колькасці асобаў, дарагія праекты, як, напрыклад, спектаклі рэжысёра Гжэгажа Яжыны «Паміж намі добра» або тэатра КТО «Сляпыя».

Сярод самых важных падзеяў, якія адбудуцца ў Мінску, можна назваць наступныя: шматлікія тэатральныя прэм'еры ў межах фестывалю «ТэАрт» у супрацоўніцтве з Мінскім цэнтрам візуальных і выканальніцкіх мастацтваў; прагляд польскіх мастацкіх і дакументальных фільмаў на Міжнародным кінафестывалі «Лістапад»; канцэрты класічнай музыкі ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі з удзелам сімфанічных аркестраў Зеленагурскай і Балтыйскай філармоній, а таксама Беларускага дзяржаўнага сімфанічнага аркестра ды польскага дырыжора і выдатнага піяніста Яна Кшыштафа Броі; канцэрты сучаснай музыкі з выкарыстаннем мультымедыйных сродкаў; канцэрт у выкананні джазавага піяніста Влодэка Паўліка і Грэгарыянскага хору ў Кафедральным саборы ды польскага гурта «Zakopower» у канцэртнай зале «Мінск».

Чым адметная спецыяльная праграма «I, Culture», падзеі якой таксама адбудуцца ў Мінску?

– «I, Culture» — замежная культурная праграма старшынства Польшчы ў Радзе ЕС, назва якой літаральна перакладаецца як «Я, культура».

Праграма адлюстроўвае не толькі нацыянальныя рысы польскай культуры, але перадусім аспекты супольнай еўрапейскай культурнай традыцыі.

Наша праграма разлічана на самыя розныя групы насельніцтва. Мы імкнуліся паказаць як класічнае, так і элітарнае, інтэлектуальнае сучаснае мастацтва, а таксама больш лёгкі, даступны рэпертуар. У праграме «Promesa», напрыклад, ёсць фільмы для вельмі шырокага кола гледачоў, нават дзяцей. Спалучэнне такіх розных музычных жанраў, як традыцыйны грэгарыянскі харал ды імправізаваная музыка ў выкананні вядомага джазавага піяніста, будзе, несумненна, сюрпрызам для мінскіх слухачоў: і аматараў джазу, і прыхільнікаў духоўнай музыкі. А канцэрт вельмі папулярнага ў Польшчы калектыву «Zakopower», які аб'ядноўвае ў сваёй творчасці этнічныя гуральскія мелодыі з сучасным поп-рокавым гучаннем, павінен спадабацца не толькі маладым слухачам, але і дасведчаным меламанам. Тэатральнае мастацтва будзе прадстаўлена монаспектаклямі, традыцыйнымі спектаклямі, а таксама вулічнымі і лялечнымі, якія, дарэчы, уяўляюць з сябе відовішча не толькі для дзяцей. Частка праектаў будзе ажыццяўляцца ў прасторы горада, каб за імі паназіралі звычайныя мінакі (праект «Дызайн дыялогу»). Рас клад імпрэзаў і больш падрабязная інфармацыя пра іх ёсць на сайце Польскага Інстытута.

Польскі Інстытут у Мінску: **http://www.instpol.by**

Еўропа зладзіла свята для добраахвотнікаў



Еўрапейскі моладзевы форум — найбуйнейшы сход грамадзянскай супольнасці ў рамках Еўрапейскага года валанцёрства. Ён прайшоў з 7 да 11 верасня ў Брусэлі ды сабраў значную колькасць палітычных дзеячаў і прадстаўнікоў больш як 50 еўрапейскіх моладзевых арганізацый.

Каля тысячы маладых добраахвотнікаў прынеслі глыток свежага паветра ў штаб-кватэру ЕС у сярэдзіне верасня. Больш за 50 моладзевых арганізацый наведалі Брусель, каб на Еўрапейскім моладзевым форуме выявіць праблемы, якія паўстаюць сёння перад валанцёрамі, і паспрабаваць знайсці шляхі іх вырашэння, бо менавіта Еўрапейскаму году валанцёрства быў прысвечаны гэты вялікі сход.

У спіс гасцей форума трапіла і «Альтэрнатыўная моладзевая платформа», недзяржаўная арганізацыя з Беларусі. Мы сустрэліся з яе сябрам, **Юліяй Канкай** (на фота).

Калі Вы пачалі займацца валанцёрствам?

– У Беларусі цікавасць да валанцёрства была найперш звязана з цікавасцю да гісторыі ды беларускай мовы, таму годзе ў 2008-м я упершыню паўдзельнічала ў летніку моладзевай арганізацыі «Гісторыка». Але самым моцным штуршком да валанцёрства быў мой першы працоўны летнік у Італіі ў 2009 годзе. Разам з юнакамі і дзяўчатамі з Францыі, Іспаніі ды Японіі мы працавалі ў сацыяльным кааператыве, размешчаным у былых ваенных казармах. Заснавальнікі гэтага сацыяльнага цэнтра займаюцца вырошчваннем экалагічна чыстай гародніны, праводзяць тэрапеўтычныя і адукацыйныя заняткі для хворых дзяцей, а таксама штотыдзень ладзяць канцэрты або прагляд дакументальных фільмаў з абмеркаваннем сацыяльна значных падзей. Менавіта там, гледзячы на тое, як неабыякава невялічкая мясцовая супольнасць ставіцца да навакольнага асяроддзя, пачынаючы ад сваіх родных і суседзяў ды заканчваючы міжнароднымі праблемамі, я зразумела каштоўнасць актыўнага стаўлення да жыцця. У грамадстве неабыякавых людзей чалавек не можа згубіцца.

Што Вам дае дабрачынная праца?

– Вядома, што найлепшая матывацыя для чалавека — ягоныя ўнутраныя памкненні ды перакананні. Дык вось, валанцёрства ў ідэале — гэта такая дзіўная пляцоўка, дзе найлепшыя ідэі ды прафесіяналізм не абумоўлены грашовымі стымулятарамі. Акрамя таго, гэта жыццёвая прастора, дзе я сустракаю шмат таленавітых, творчых людзей і бесперапынна раблю адкрыцці ў сабе і навакольным свеце. Валанцёрства і праца над уласнымі праектамі дазваляюць значна пашырыць свой уласны свет: з часам ты перастаеш думаць, як карыстальнік, выбіраць з ужо прапанаванага, але пачынаеш самастойна ствараць магчымасці, пракладаць новыя шляхі, рабіць свет навокал сябе больш утульным.

Ці дапамагае, на ваш погляд, Еўрапейскі моладзевы форум наблізіць беларускую моладзь да еўрапейскай?

– Больш за тое, наблізіць еўрапейскую моладзь да беларускай таксама. Такія падзеі заўсёды прыносяць некалькі безумоўных вынікаў: сяброўства і паразуменне паміж людзьмі. Гэта цяжка яшчэ назваць вынікам для ўсёй беларускай моладзі, але менавіта на такіх кантактах будуюцца потым сталае супрацоўніцтва і салідарнасць.

Чаго валанцёры з розных краін чакалі і якія ўражанні яны атрымалі ад Еўрапейскага моладзевага форума, даведаемся з першых вуснаў.

Кацярына Лясінская
Мінск (Беларусь)

– Валанцёрствам я займаюся ўжо каля сямі гадоў. Для мяне Еўрапейскі моладзевы форум — выдатная платформа для лабіравання патрэбаў, інтарэсаў і правоў моладзі — як на еўрапейскім, так і на нацыянальным узроўні.

Дабрачынная праца дае мне ўпэўненасць у тым, што мае ўнутраныя намаганні накіраваны на знешнія патрэбы, на вырашэнне праблем і паляпшэнне тых умоваў, якія ў пэўнай ступені не адпавядаюць жаданням аб'ектаў, што знаходзяцца з імі побач.

Родзіка Жардан
Кішынёў (Малдова)

– Я шмат працую з валанцёрамі, а таксама нярэдка ўдзельнічаю ў розных праектах або ініцыятывах як добраахвотніца, бо гэта стварае для мяне кароткія моманты шчасця і самарэалізацыі. Гэта добры спосаб выпрабаваць такія пачуцці, як адказнасць. Ад Еўрапейскага моладзевага форума я заўсёды чакаю яшчэ больш адказнасці ды ўсё больш і больш праектаў.

Гуяш Віраг
Будапешт (Венгрыя)

– Я вельмі шчаслівая, што яны абралі менавіта мяне, бо я ведаю, што са 100 заявак ім трэба было абраць толькі 50, а ў мяне яшчэ не было ніякага досведу добраахвотнай працы. Гэта мой першы досвед, і я чакаю, што мы будзем выдатна бавіць час.


Я вельмі чакала гэтай падзеі. Пакуль я не ведаю, як гэта — працаваць і не атрымліваць за гэта грошай. Рэч у тым, што я з Усходняй Еўропы, а там такі від працы яшчэ не вельмі папулярны, і людзі не вельмі шмат ведаюць пра валанцёрства.

Усё пра Еўрапейскі моладзевы форум: **http://www.youthforum.org/**



ЕС—Беларусь: время культурных открытий

Совместная культурная программа Беларуси и пяти стран Европейского Союза (Германии, Литвы, Португалии, Швеции и Эстонии) «Открывай Европу — открывай Беларусь» стартовала в марте этого года. О ходе реализации программы расскажет ее координатор в Беларуси Вадим Можейко.





Культура единой Европы и будущее

В польском городе Вроцлаве прошел Европейский конгресс культуры. В нем приняли участие более 300 представителей европейской мысли. Среди них такие известные имена, как Зигмунд Бауман, Умберто Эко, Вацлав Гавел. Об этом мероприятии читайте в следующем номере.

Подробнее на сайте: **www.culturecongress.eu**





18 сентября в Минском «Дворце искусств» прошла творческая мастерская современных ремесел **I, CULTURE PUZZLE**. Глобальный проект **I, CULTURE PUZZLE** состоялся в рамках международной культурной программы польского председательства в Евросоюзе в 10 столицах мира — от Мадрида до Токио.









